# 6 верасня - Дзень беларускага пісьменства


МАСТОЎСКАЯ РАЁННАЯ ГАЗЕТА

# Зара над Нёманам

www.mosty-zara.by

ГАЗЕТА ВЫДАЕЦЦА З 1945 ГОДА

№68 (8878)

СУБОТА, 5 верасня 2015 года

Цана 2500 руб.




*Любіце травы, дрэвы, рэкі,*
*Прастор палёў, блакіт нябёс,*
*Цаніце Працу, Чалавека, -*
*Ї Бог вам дасць спагадны лёс.*
*А каб цанілі вас у свеце*
*(Я лепшых слоў не падбяру),*
*Шануйце дзіва на планеце -*
*Святую нашу Беларусь.*
*Ї мову Коласа, Купалы*
*Вы беражыце з роду ў род,*
*Каб наша воля не прапала,*
*Каб не загінуў наш народ.*

*А. Ставер*



**Святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню беларускага пісьменства, пройдуць 5-6 верасня ў горадзе Шчучын**







# Шануйце мову сваю

*Я к вядома, мэта настаўніка - даць веды школьнікам па прадмеце. Але функцыя настаўніка беларускай мовы і літаратуры гэтым не абмяжоўваецца.*

Раскрыць дзецям прыгажосць роднай мовы, паказаць яе мілагучнасць, далучыць да невычэрпных крыніц беларускай літаратуры, мастацтва, гісторыі роднага краю – гэтыя задачы ставіць перад сабой настаўнік беларускай мовы.

Сёння, у час камп'ютарызацыі і разнастайнасці сродкаў інфармацыі, вучні вельмі мала чытаюць і гавораць па-беларуску, таму паўстаюць пытанні: як зацікавіць вучняў роднай мовай, падтрымаць цікавасць да прадмета і жаданне вывучаць мову!?

У першую нядзелю верасня Беларусь адзначае Дзень беларускага пісьменства і друку. У гэтым годзе свята прыпадае на 6 верасня. Гэты дзень стаў традыцыйным і ў ДУА «Сярэдняя школа №3». Настаўнікі і класныя кіраўнікі праводзяць мерапрыемствы, накіраваныя на выхаванне любові і пашаны да мовы Бацькаўшчыны.

Планамі на будучы вучэбны год падзялілася Алена Чаславаўна Коцка - намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА «Сярэдняя школа №3»:

-- Сёлета мы плануем правесці школьны конкурс чытальнікаў "Жывая класіка", прэзентацыю "Шчучын – сталіца Дня беларускага пісьменства", будзе арганізаваны выпуск газет, прысвечаных жыццю і творчасці беларускіх пісьменнікаў, класныя гадзіны "Жыве ў вяках беларускае слова" і інш.

Як зразумела, правядзеннем аднаго такога свята выклікаць у вучняў цікавасць да мовы цяжка. У гэтай школе праводзяцца і іншыя мерапрыемствы, накіраваныя на пашырэнне сферы выкарыстання і папулярызацыі беларускай мовы, выхавання ў падлеткаў павагі і любові да роднага слова, цікавасці да твораў беларускіх пісьменнікаў. Штогод праводзяцца Тыдні беларускай мовы і літаратуры, акцыі "Размаўляй са мной па-беларуску" (да Дня роднай мовы). Вучні школы рэгулярна прымаюць удзел у рэспубліканскім конкурсе па беларускай мове і літаратуры "Буслік", у навукова-практычных канферэнцыях і алімпіядах.

Такая праца дарэмна не праходзіць. На раённай навукова-практычнай канферэнцыі "Пошук. Творчасць. Пазнанне" вучні гэтай школы за свае навукова-даследчыя працы па беларускай мове і літаратуры заўсёды займалі прызавыя месцы (Лізавета Папянюк, Паліна Сарвас, Вольга Жылеўская, Ксенія Панкевіч, Дар'я Хілько). Акрамя раённай, выпускніца 2014 года Кацярына Рагачэўская прымала ўдзел у канферэнцыях г. Ліды і Ваўкавыска, дзе яе праца была адзначана дыпломамі I і II ступені. На абласной канферэнцыі "Крыштальная альфа" ў 2013 годзе яна атрымала грамату.

"Мы вельмі ганарымся выпускніцай 2015 года Анастасіяй Дзенісевіч. Яна чатыры гады запар станавілася прызёрам раённай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры, і як вынік - на цэнтралізаваным тэсціраванні атрымала 100-балаў", - дадае Алена Чаславаўна.

Зыходзячы з гэтага, можна сказаць, што праца А.Ч.Коцкі недарэмная, калі ёсць такія таленавітыя вучні.

«Шануйце мову сваю!» – заклікаюць беларускія пісьменнікі. У гэтым жа накірунку працуюць і настаўнікі ўсіх школ, не толькі выкладчыкі роднай мовы.

**В.СТАСЮКЕВІЧ**

Рэпортёр выходзит в свет

# Хранилище сокровищ - письменность

***Попробуйте представить себе, какой была бы наша жизнь, если бы тысячи лет назад люди не придумали письмо. Каким способом тогда бы пришлось излагать свои мысли, закреплять в документах важную информацию? Весь опыт людей передавался бы из поколения в поколение только устно.***

Народы всего мира ценят письменность как особый дар. Ведь слово имеет огромную силу. Далеко не сразу появились те формы письма, о которых знает каждый третий человек. Что для человека письмо, слово, насколько важен белорусский язык и почему так необходим День письменности, мы узнали у жителей города Мосты.



**Дмитрий Александрович БУТЬКО, главный специалист сектора социально-воспитательной работы отдела образования, спорта и туризма Мостовского райисполкома:**

-- Наш отдел будет присутствовать на празднике в Щучине, и принимать всяческое участие, поскольку День письменности важен не только для взрослого поколения. Он играет немаловажную роль в воспитании детей.

Образование формирует патриотизм, а дети с первых лет жизни должны понимать всю важность письменности и родного языка. Белорусский язык – национальный. Связь поколений – вот, что важно.

**Марина Михайловна ЯЧКОВСКАЯ, участница народного ансамбля народной песни «Ярыца»:**



-- Для меня этот праздник важен по трём составляющим: праздник, работа, жизнь. Во-первых, ансамбль народной песни «Ярыца» не в первый раз принимает участие в Дне письменности. Когда поём белорусские песни, нас понимают все зрители. Бабушки чувствуют, какой огромный вклад они принесли в жизнь.

Хотелось бы, чтобы каждый из нас мог говорить на белорусском языке, уважать традиции и культуру народа. Благодаря родному языку мы формируем патриотизм.



**Татьяна Георгиевна ХОМЯКОВА, учитель начальных классов ГУО «Общеобразовательная средняя школа №3 г. Мосты»:**

-- День письменности – общенациональный праздник. В первую очередь, он показывает, что не стоит забывать о национальных традициях. Конечно, помнив об этом важном дне, мы с уважением относимся к предкам.

Ни при каких обстоятельствах не стоит забывать о красивейшем белорусском языке, о прекрасном родном крае. С гордостью и уверенностью можно сказать, что День письменности – значимый день.

**Алеся МАКАРЕВИЧ, экономист по финансовой работе ОАО «Гронитекс», г. Гродно:**



-- День белорусской письменности – один из самых важных праздников. Ведь он показывает и выражает любовь народа к своим традициям, родному языку и письму.

Как человек, познакомившийся с белорусским языком недавно, могу сказать, что язык весьма интересный и колоритный, имеет свою народность и «изюминку», очень мелодично звучит в стихах и фольклорных песнях. Это придаёт ему большую значимость и особенность. Считаю, что необходимо изучать свой государственный язык, чтобы поддерживать культуру и самобытность народа.

***День белорусской письменности проводится ежегодно в первые выходные сентября. Традиционно он показывает обществу единство белорусского народа, отражение исторического пути письменности и печати в Беларуси.***

**А. МАКАР**
**Фото автора**



# «Я душу раскрою настежь: читайте мой заветный лист...»



***«Кто я? Самобытный поэт», - говорит мне при встрече героиня сегодняшней публикации Галина Иосифовна Василевская. Художник, фотограф, специалист по компьютерной графике, поэт, дизайнер-оформитель в Мостовской районной центральной библиотеке, режиссер театра кукол «Петрушка», член литературного объединения «Небесный знак», победитель многих конкурсов - все это про нее. А еще это очень скромный человек. Впрочем, как и все по-настоящему талантливые люди.***

***-- Над чем Вы работаете в данный момент?***

- В последнее время для себя практически не остается времени. А так хочется порисовать. Вот мои работы по технике батика (особой росписи на ткани). Этим видом художественного творчества я увлеклась после прохождения курсов декоративно-прикладного искусства. Это мое хобби. Все же большую часть своего времени я посвящаю библиотеке. Оформлять залы, стенды, выставки, буклеты - моя основная дизайнерская работа вместе с методистами. У нас провинция, все делаем своими руками. Недавно закончила работу над «самаробная кнігай» с собственными произведениями, которая будет представлена на конкурсе в Щучине в День белорусской письменности 5-6 сентября.

***-- Библиотека дает Вам простор для реализации себя?***

- Я очень рада, что в 2000 году пришла сюда. Если бы не столкнулась с таким тесным общением с книгой, не была бы той, которой являюсь сегодня. Это место работы направило меня по пути творчества. Я же с детства писала стихи. Но после школы был большой перерыв. И только благодаря особой атмосфере, которая царит в «храме книги», я снова начала сочинять. Именно библиотека помогла мне реализовать свои профессиональные данные.

***-- Как и в какие моменты Вас посещает вдохновение?***

- Раньше вдохновение чаще забегало ко мне. А теперь, как в легенде про птицу Феникс, оно где-то исчезает, сгорает. Но обрести его вновь можно. Помогают поездки, новые обстоятельства, впечатления, люди. Эмоции накапливаются в уме и сердце, но могут долго не проявляться. Как вдруг из ниоткуда рождаются строчки. Их нужно срочно записать, а то забудутся. Иногда ночью не спится. Смотрю на луну и тоже пишу стихи. А еще я безумно люблю природу. Она мне необходима. Часто чувствую: срочно нужно подзарядиться, почерпнуть энергетику. Тогда беру фотоаппарат, обязательно листок бумаги и ручку, чтобы записать стихи, которые обычно приходят в такие моменты, и иду гулять по лесу.

***-- Вы согласны с распространенным мнением, что успех определяется 10% таланта и 90% упорного труда?***

- Часто приходится слышать такое выражение. Но я считаю, что отводить всего 10% для способностей от природы – это слишком мало. Хотя бы половину. Конечно, без труда и усилий даже очень талантливый человек ничего не сделает, если он ленивый. Только упорная работа развивает дар.

***-- Как Вы относитесь к стихам на заказ?***

- Случается, меня просят написать стихотворение на определенную тематику. Например, к празднику. Поначалу противилась и не могла понять: как можно заказать творчество? Но потом просто садилась, думала и писала. В итоге всегда получается очень хорошо. То есть талант подключается вслед за трудом. Еще мне помогает чтение других авторов. После этого всегда возникает нечто свое. Я остро переживаю события Второй мировой войны и верю в переселение душ. Мне кажется, я жила в то время. Очень остро чувствую боль, когда мне что-то об этом напоминает. Так было и после того, когда в этом году на глаза попался альбом к 70-летию войны.

***-- Что Вам больше всего по душе из огромного перечня собственных увлечений?***

- Работа со своим воображением. Когда творишь, воплощаешь новые идеи и задумки. Как правило, это все проходит в свободное время и находит отражение в конкурсах, в которых я участвую. Но и повседневная работа по оформлению библиотек, в том числе сельских, мне нравится. Здесь также можно проявить творческую силу: там горшочек, тут цветочек поставить. Особенного старания и креатива требуют детские отделы. Их нужно делать не только с надписями, но с обилием красочных и забавных рисунков.

Кроме того, по совместительству Галина Иосифовна ведет кружок. Это местный кукольный театр «Петрушка. Наверняка слышали, а может, даже были зрителями рождественских постановок. Искусная мастерица собственными руками шьет прекрасных «живых» кукол и верит, что у них есть душа. Это большой кропотливый труд. И когда работа окончена, нет большего счастья, чем видеть свое детище. Галина Иосифовна признается, что ни за какие деньги не продаст «артистов».

Такого чуткого и влюбленного во все прекрасное преподавателя любят и уважают подопечные – ребята кружка «Петрушка». Этим летом они все вместе посетили два представления Гродненского областного театра кукол - «Маленький Мук» и «Принцесса на горошине». Не просто, как любопытные зрители а с целью обогащения собственного опыта. «Видите, как они выходят? Смотрите, как сделали эту штуку. Может, и нам так попробовать?» - наперебой советует своему наставнику детвора.

Кабинет Галины Иосифовны напоминает уютную творческую мастерскую. Стеллажи книг хорошей литературы, авторские полотна на стенах вместе с заслуженными грамотами, портрет одного из любимых поэтов -- Есенина. Напоследок художница показала мне часть своих кукол, которые послушно ждут выхода на сцену, рассказала истории их появления на свет, которым мы вместе порадовались, вручила сборник своих стихов. Ими и закончу эту историю.

*А час так бяжыць,*
*бяжыць,*
*Закон зямлі вечным*
*будзе,*
*Імгненнямі*
*даражыць, даражыць,*
*Ці ўмеем мы з вамі,*
*людзі?*

**В. ТРЫНКИНА**

# Её стихи написаны так рано



***Ценности... какие они сегодня? В эпоху интернета и высоких технологий нужна ли кому-то такая неотъемлемая составляющая культуры, как поэзия? Какую роль сейчас она играет в жизни молодого поколения?***

Мария Михалевич работает мастером цеха по выпуску плит МДФ ОАО «Мостовдрев». Оказалась девушка на предприятии после окончания Белорусского государственного технологического университета по специальности «Инженер-химик-технолог». Основная забота молодого специалиста - организовать контроль за технологическим процессом всех линий участка, который ведётся в автоматическом режиме. Главное, что работа девушке нравится.

Детство Марии прошло в Ошмянах. Ответственная девочка всегда искала себя в новых направлениях. Сейчас у девушки есть главная ценность – стихи. В свободное время она предпочитает оставаться наедине с природой. Отдых в кругу друзей и пейзажей помогает Марии находить вдохновение для написания новых стихов.

-- Стихи -- это единственное, что мне никогда не надоест, какое бы настроение не было, -- делится с нами Мария.

Девушка призналась, что с детства любила читать книги. «Гордость и предубеждение» Д. Остин, произведения Д. Лондона, Э. М. Ремарка увлекают Марию в мир таинств.

-- Также люблю произведения Ивана Шамякина. Помню, когда-то попался мне на глаза сборник повестей «Тревожное счастье». После прочтения книги сразу же побежала в библиотеку за другими произведениями автора, - добавила Мария.

Юная поэтесса в восторге от стихов Марины Цветаевой. Правду говорят, что человеку необходим тот, на которого стоит равняться. Пусть Мария станет такой творческой личностью, чтобы вскоре начинающие юные поэты могли брать в качестве примера стихи мастера цеха по выпуску плит МДФ ОАО «Мостовдрев».

-- В детстве я часто сочиняла стихи. Но тогда это были детские и маленькие четверостишья. Мама пыталась записывать мои начинания. Честно признаться, я даже и не считала, сколько в копилке уже написанных стихов, -- рассказала Мария.

У девушки создана своя группа в социальных сетях, где она может делиться своим увлечением с окружающими. В планах только совершенствование. А мы можем познакомиться с творчеством Марии, которая смогла найти свои главные ценности и совместить работу со стихами.

### Напутствие

*Оставить на мгновение людей,*
*Уйти от всех и спрятаться на время,*
*Забыть на миг про взрослых и детей,*
*Которые не знают про терпенье.*
*И в тот же миг иною становиться,*
*Менять в себе все мелочи, и все,*
*Что больше никогда не повторится,*
*Оно ведь лишнее, оно ведь не твое.*
*И ты пойдешь спокойно и беспечно,*
*Шагая мимо горя и беды,*
*Но помни: счастье - быстротечно,*
*И точно не прощает суеты.*
*А если что, то просто улыбайся,*
*Бестрашным взглядом посмотри вперед,*
*Но только в прошлом не копайся:*
*Что было раньше, больше не придет.*
*Оно уйдет из жизни также быстро,*
*Как солнца свет доходит до земли,*
*А ты живи и думай очень чисто,*
*Коль силы есть, то чудеса твори.*

**А. МАКАР**
**Фото из личного архива М. МИХАЛЕВИЧ**



# Общение без границ





***Библиотекарям тяжело конкурировать с телевидением, информационными технологиями, но, тем не менее, читатели, которые приходят к нам, ощущают, что им всегда рады, что на вопросы, с которыми они обращаются, будут обязательно даны ответы. Но как быть тем, кто живет в населенных пунктах без библиотек? С целью расширения библиотечного обслуживания сельского населения создана и активно используется в Мостовском районе мобильная передвижная система обслуживания читателей отдаленных деревень и малонаселенных пунктов – библиобус .***

Более восьми лет колесит по дорогам района внестационарный пункт обслуживания населения книгой. За первое полугодие был осуществлен 51 выезд по 9 маршрутам, обслужено больше чем 650 читателей. Книговыдача составляет более 7000 экземпляров. Наши читатели -- это работники сельского хозяйства, пенсионеры, инвалиды, учащиеся, мамы, которые находятся в декретном отпуске. В среднем, библиобус выезжает 2-3 раза в неделю, но в одной конкретной деревне бывает чаще раза в месяц. За это время некоторые читатели уже успевают соскучиться. Выезды осуществляются согласно графику работы по запланированным маршрутам. Протяженность некоторых деревень большая, а основная часть читателей -- пенсионеры преклонного возраста, поэтому некоторые обслуживаются на дому. По маршруту выезда делаем ряд остановок. В обслуживании населения используется индивидуальный подход.

Помимо выдачи литературы, мы проводим и массовые мероприятия: «Открываем книгу – открываем мир» -- книжная выставка в д. Мижево; «Нам жить и помнить» -- открытый просмотр литературы, посвящённый 70-летию Великой Победы в д. Руда Липичанская; «Огород без хлопот» -- мини-лекция в д. Котчино. А также проводим разные акции, обзоры, консультации, тематические выставки и мн.др.

Также мне хотелось бы отметить нескольких моих самых читаемых посетителей: семьи Микулич, Прядеины, Мазан и Булавик из деревни Кульшичи; семьи Зобковых и Жук из деревни Мижево; семьи Грецких и Кравченко, Татьяна Иосифовна Боярчик и Зинаида Владимировна Сало из деревни Неман; семья Кемко из Ковшово; семьи Дьяченко, Сергень и Товкун из Нацково; семьи Майсюк и Януль из д. Котчино; семья Еремич из д.Огрызки и Галина Ивановна Клочко из Парфенович. Также у меня есть читатели "сезонные", которые, даже находясь у себя на дачных участках, не перестают баловать себя хорошей литературой. Это семейная пара Терешко из Волковыска, которая приезжает на лето в д.Задворье, и Валентина Петровна Макей из Гродно, которая приезжает в д.Котчино. А самой читаемой деревней является Мальковичи. Эту деревню мы начали обслуживать только в этом году. Люди в дни нашего приезда ждут нас возле магазина, с большой охотой и в большом количестве берут литературу. Особенно хотелось бы отметить таких читателей, как Татьяну Петровну Касач и Нину Яковлевну Нурудинову.

У каждой деревни -- свои предпочтения. В некоторых выбирают сугубо детективы и любовные романы, а также журналы о сельском хозяйстве («Сад и огород», «Хозяин») и рукоделии («Ксюша», «Мастерица», «Делаем сами»). Некоторые читатели интересуются фантастикой, историческими романами, кто-то просит литературу о здоровье. Самыми читаемыми авторами детективного жанра являются Колычев, Сухов, Владимиров, Жарко, Казанцев и мн. др., а среди белорусских авторов большой популярностью пользуются Чергинец, Климкович, Трахименок . Среди авторов дамского романа популярны Знаменская, Батракова, Коултер, Смолл, Нестерова и мн. др. Библиобус имеет свою подписку, но в основном, его фонд формируется из общего фонда районной библиотеки. Сельчане с нетерпением ждут нас с книгами, зная, что приветливый библиотекарь любезно предложит новинку, подскажет, посоветует. Да и настроение поднимет, ведь доброе слово так важно, особенно для проживающих в таких деревушках стариков. Они всегда с радостью пользуются услугами библиобуса и с нетерпением ждут новых встреч с книгой. Многие старики живут одни, им порой бывает не с кем поговорить, поэтому нам часто изливают душу. Приходится быть и психологами. Посоветовать, поддержать словом. Бывает, беседа затягивается на часы, но не скажешь же бабушке, которая раскрывает секреты своей жизни, что нам пора.

Прибытие библиобуса в глубинку – это целое событие для людей. К тому же у этой новой формы работы большие перспективы: ведь мы стремимся предлагать людям здоровую духовную пищу как альтернативу от одиночества и деградации.

**О. ЛЕВЧИК,**
**библиотекарь отдела обслуживания и информации**

# «Забыць цябе я маю сілы?»




***Многим белорусская литература покажется сложной по восприятию слов. Дети в школе , порой, не понимают, что, читая «сокращёнку», не поймёшь всю глубину и красоту белорусского национального языка. Всё чаще можно услышать утверждение: «Наш язык утрачивает популярность и не интересен так, как предыдущему поколению». Что это: очередной миф? Мы поинтересовались у жителей нашего города, любят ли они родной язык и какую литературу предпочитают.***

**АНДРЕЙ, 23 года:**
-- Очень люблю читать. С самого детства предпочитал белорусскую литературу: родной язык, такие тёплые отзывы о знакомых местах. Несколько раз перечитывал поэму Якуба Коласа «Новая земля». Рассказ про быт семьи лесника Михаила, про его мечты и цели. Мне кажется, что именно в этой поэме показана вся тонкость белорусской человеческой души, когда человек, несмотря ни на что, не отчаивается и верит в светлое будущее. Каждый раз, когда я куда-нибудь уезжаю, и спустя время, возвращаюсь домой, всегда вспоминаю любимые строки.

**ЮЛИЯ, 18 лет:**
-- А я вот, вообще, не люблю читать. Ни белорусскую литературу, ни русскую… Иногда могу полистать зарубежную классику, но, увы, терпения хватает не надолго. И ничего не могу с этим сделать. Очень уважаю тех людей, которые много читают. Они всегда мне казались недосягаемыми и интересными личностями.

**АЛЕКСАНДР, 34 года:**
-- Какой же интересный роман «Люди на болоте» Ивана Мележа! Не устаю перечитывать эту книгу. Каждый раз нахожу что-то новое, между строк вижу скрытый смысл, который пригодится в жизни каждому из нас. Я очень люблю историю, а автор здесь с точностью описал жизнь и быт белорусского населения на примере жителей глухой деревеньки. Это довольно интересно!

**КИРИЛЛ, 26 лет:**
-- Сразу вспоминается повесть «Данута» Алексея Карпюка. Меня впечатлила история любви сына белорусского крестьянина Янки Бартошевича и Дануты Янковской, дочери генерала. Автор показал всю сложность событий, противоречий, их стойкость и выдержку. Наверное, я еще не влюблялся так сильно, но всё же на протяжении всего времени, что читал книгу, параллельно переживал вместе с главным героем.

**ОЛЬГА, 31 год:**
-- Ответ на такой вопрос только один: «Записки Самсона Самасуя» Андрея Мрыя. Даже на первых курсах в университете очень заинтересовалась им. Было занятие, когда мы всей группой делали постановку по произведению. Весело получилось.

**МНЕНИЕ**

**Светлана Ивановна ЛАЗАРЕНКО,**
**библиотекарь Мостовской районной детской библиотеки:**
-- Отношение к белорусскому языку формируется не за один день: его по мере взросления ребёнка формируют сначала родители, затем -- школа и университет. Для детей школьного возраста интересно в основном то, что задают по программе: Иван Мележ, Кузьма Чёрный, Янка Купала, Якуб Колос, Владимир Короткевич. В младшем школьном возрасте (2-4 класс): В. Яговдик, Р. Боровикова.

***В белорусских книгах сюжеты и темы – родные, интересные тем, кто рождён на нашей земле. Достаточно только открыть книгу, и она позовёт нас в мир таинств и белорусской самобытности!***

**А. МАКАР**





# Бібліятэка! Ты - сузор'е кніг, крыніца думак і пачуццяў розных!



***Да нядаўняга часу галоўнай крыніцай, з якой чалавецтва чэрпала веды, былі кнігі. А яны захоўваліся ў бібліятэках. Многія яшчэ са школьных урокаў гісторыі памятаюць пра Александрыйскую бібліятэку. Пачатакяе стварэнню паклаў Аляксандр Македонскі. Па розных звестках, у перыяд росквіту ў бібліятэцы налічвалася да 700 тысяч папірусных скруткаў на розных мовах. І ў свеце тады не існавала ні аднаго каштоўнага рукапіснага дакумента, копіі якого не было б у Александрыйскай бібліятэцы.***

***Значэнне бібліятэкі як аб'екта культурнай спадчыны не зменшылася і ў нашы дні. Яркае сведчанне таму Нацыянальная бібліятэка Беларусі, дзе сабрана 8 мільёнаў адзінак захоўвання. Толькі сёння місія бібліятэкі збіраць, захоўваць і галоўнае прадастаўляць у карыстанне грамадству ўніверсальны фонд дакументаў, якія адлюстроўваюць веды чалавецтва, значна пашырылася.***

***А яшчэ Нацыянальна бібліятэка Беларусі - унікальны памятнік архітэктуры.***



Вядома, васемнаццаці бібліятэкам нашага раёна з фондам экземпляраў дакументаў больш за 350 тысяч па значнасці далёка да Нацыянальнай, але ў межах Мастоўшчыны са сваёй культурнай асветніцкай роляю і задавальненнем інфармацыйных і пазнавальных запатрабаванняў чытачоў яны спраўляюцца паспяхова.

Гісторыя адной з лепшых і старэйшых Рагозніцкай сельскай бібліятэкі пачалася ў жніўні 1949 года. Праўда, тады яна называлася хатай-чытальняй і знаходзілася ў звычайным сялянскім доме. Фонд бібліятэкі налічваў 426 экземпляраў кніг і змяшчаўся у двух самаробных шафах-стэлажах. А сёння фонд гэтай бібліятэкі налічвае 17880 экземпляраў. Першым бібліятэкарам была Ганна Уладзіміраўна Украінская, якая пазней пераехала ў Казахстан.

З 70-х гадоў мінулага стагоддзя і да нядаўняга часу бібліятэка размяшчалася ў прасторных пакоях былога панскага маёнтка. Для юных чытачоў быў выдзелены асобны пакой, у якім быў створаны куточак прыроды. Адной з першых у раёне Рагозніцкая бібліятэка аформіла этнаграфічны куток сваёй мясцовасці, дзе былі сабраны экспанаты з "бабуліных куфраў": адзенне, прадметы хатняга ўжытку нашых продкаў.

Цікава, што былы гаспадар маёнтка, у якім да 2008 года размяшчалася бібліятэка, Прушынскі, які жыве за мяжой, заўсёды, калі наведвае родныя мясціны, заходзіць у дом, дзе прайшло яго маленства, любіць пачытаць перыядычныя выданні. Шмат цікавых гісторый пачулі ад яго бібліятэкары.

У савецкія часы сельская бібліятэка прапагандавала сярод працаўнікоў вёскі сельскагаспадарчыя веды. У чытальнай зале былі аформлены інфармацыйныя стэнды: "Пяцігодка нашага калгаса", "Лепшыя людзі калгаса", "Іншаю стала ты, наша вёска". Кніжны фонд прадстаўлены тэматычнымі паліцамі: "Весці гаспадарку эканомна і ашчадна", "Механізатар -- гаспадар тэхнікі", "Што чытаць паляводу", "Вам, жывёлаводы!".

Больш за дзесяць гадоў бібліятэка з'яўлялася пераможцам спаборніцтва і насіла званне "Установа выдатнай работы". А ў 1973 годзе Рагозніцкая бібліятэка за поспехі, дасягнутыя ў ходзе рэспубліканскага агляду, прысвечанага 50-годдзю ўтварэння СССР, была ўзнагароджана дыпломам.

Усё гэта заслуга працавітай ініцыятыўнай жанчыны Уршулі Аляксандраўны Заяц. У 1959 годзе васемнаццацігадовай дзяўчынай прыйшла яна на работу ў бібліятэку і адпрацавала там сорак адзін год. Увесь гэты час бібліятэка пад кіраўніцтвам Уршулі Аляксандраўны дапамагала мабілізоўваць працаўнікоў вёскі на выкананне вытворчых планаў і заданняў.

Бібліятэкар добра ведала густы сваіх чытачоў. Яна магла не толькі параіць пачытаць добрую кнігу, але і падказаць, якімі народнымі лекамі лячыць тую ці іншую хваробу (кніг па народнай медыцыне ў бібліятэцы хапае), падзяліцца рэцэптам прыгатавання смачнага пірага. Людзі ішлі ў бібліятэку не толькі за кнігамі, але і за добрымі парадамі. Кожнага наведвальніка бібліятэкар магла ўважліва выслухаць, падтрымаць. А што яшчэ бывае ў жыцці даражэй, чым добрае слова, сказанае чалавеку своечасова? За добрасумленную працу Уршуля Аляксандраўна Заяц адзначана Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Міністэрства культуры БССР, Ганаровымі граматамі Упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама. У 2014 годзе была выдадзена кніга пра гістарычную і духоўную спадчыну нашага рэгіёна "Культура Гродзеншчыны, Факты. Падзеі. Асобы". Сярод лепшых бібліятэкараў вобласці ў раздзеле "Кніжныя скарбніцы Прынёманскага краю" была адзначана праца У.А. Заяц.

-- Калі для іншых бібліятэка толькі крыніца ведаў і інфармацыі, дык для мяне яна ўсё маё жыццё. Адпрацавала ў бібліятэцы сорак адзін год. Тады вяскоўцы чыталі больш, бібліятэка была не толькі інфармацыйным, але і культурным цэнтрам на сяле. Колькі розных мерапрыемстваў мы ладзілі з дарослымі і дзецьмі! Хоць зарплата ў бібліятэкараў ніколі не была вялікай, мне ні разу не прыходзіла думка, каб памяняць работу. І сёння люблю пачытаць добрую кнігу. Перачытваю беларускую, рускую і замежную класіку. У свае 75 год не перастаю вучыцца ў пісьменнікаў-класікаў пазнаваць жыццё. Па-новаму сёння адкрылася для мяне творчасць Льва Мікалаевіча Талстога. Яго творы можна перачытваць бясконца, і кожны раз адкрываць для сябе нешта новае, нязведанае, -- разважае Уршуля Аляксандраўна аб прафесіі бібліятэкара і добрай кнізе.

Сёння справу Уршулі Аляксандраўны працягвае Соф'я Эдвардаўна Кавалевіч, якая працуе ў бібліятэцы з 2010 года. На працягу года бібліятэку наведваюць больш за 1500 чытачоў, якім выдаецца ў часовае карыстанне больш за 23 тысячы дакументаў.

З мэтай больш шырокага задавальнення інфармацыйных патрабаванняў чытачоў у чытальнай зале аформлены і дзейнічае даведачна-інфармацыйны цэнтр.Тут знаходзяцца папкі з інфармацыяй па медыцыне, адукацыі, культуры, спорту, сельскай гаспадарцы рэгіёна.

З 2002 года бібліятэка аказвае платныя паслугі насельніцтву: выдачу літаратуры з камерцыйнага фонду. Попытам у чытачоў карыстаецца выдача відэакасет і DVD-дыскаў.

Творча ставяцца работнікі бібліятэкі да арганізацыі вольнага часу мясцовага насельніцтва. Гэтая работа ладзіцца з улікам узросту і інтарэсаў чытачоў, іх тэматыка featuring розгабаковая. Шмат увагі ўдзяляецца папулярызацыі беларускай і літаратуры краязнаўчага характару, якія садзейнічаюць выхаванню культуры чытача, захаванню духоўных каштоўнасцей.

З 2003 года пры Рогозніцкай бібліятэцы працуе аматарскае аб'яднанне "Чамучкі" для самых маленькіх чытачоў. Дэвіз аб'яднання:

"Толькі той жыве, як трэба,
І ўсё лёгка даецца таму,
Хто ўмее справы ладзіць
Са шматлікімі "Чаму?"

Любіць і цаніць добрую кнігу Соф'я Эдвардаўна Кавалевіч вучыць сваіх маленькіх чытачоў, пачынаючы з садаўскага ўзросту. Гэтаму спрыяе і той факт, што бібліятэка сёння знаходзіцца ў адным памяшканні з дзіцячым садам.

-- Я сама заахвоцілася чытаннем з ранняга дзяцінства. У свой час цэлымі днямі прападала ў бібліятэцы, перачытала амаль усе дзіцячыя кнігі, якія там былі. Тое, што асабліва падабалася, перачытвала па некалькі разоў. Да добрай кнігі з таго часу адносіны трапяткія і паважлівыя, як да самага блізкага сябра, -- дзеліцца думкамі С.Э. Кавалевіч.

**Я. ЦЕСЛЮКЕВІЧ**

# Желаем счастья!

**С 25-летием совместной жизни поздравляем**
**ЕЛЕНУ СТАНИСЛАВОВНУ И ВЛАДИМИРА ВЛАДИМИРОВИЧА ЮРАГА!**

*Серебряная свадьба - это значит,*
*Что вас Господь друг другу предназначил,*
*Так пусть всегда сбываются мечты,*
*Мы вам желаем счастья и любви.*
*В дальнейшем вы друг другу помогайте,*
*Поддерживайте и не унывайте!*
*Пусть только всё хорошее случится*
*И озарит улыбка ваши лица!*

**Сын Андрей, семьи Юрага и Мазан**

**УВАЖАЕМАЯ НАТАЛЬЯ ВАСИЛЬЕВНА ЗАРЕМБЮК!**
**Поздравляем Вас с юбилеем!**

*Пусть будет добрым каждый час,*
*Прекрасным настроенье,*
*Пусть повторятся много раз*
*Счастливые мгновенья.*
*Пусть дарит жизнь любовь и свет,*
*Надежду и везенье,*
*Желаем счастья, долгих лет,*
*Удач и вдохновенья!*

**Музыкальные руководители Мостовского района**

**ДОРОГАЯ ЕЛЕНА ДМИТРИЕВНА КУХЛЕЙ!**
**Поздравляем с юбилеем!**

*55 -- для женщины не старость,*
*В 55 -- цветёт её душа,*
*Так пускай уйдёт с лица усталость,*
*Оставайся вечно молода.*
*Тебя мы ценим, любим, уважаем,*
*Готовы весь мир на свете подарить.*
*И искренне в юбилей желаем*
*Самою счастливой в мире быть!*

**С уважением братовая Алина и её семья**

**ДОРОГУЮ ДОЧЕНЬКУ, СЕСТРУ И ТЁТЮ ОЛЬГУ АЛЕКСАНДРОВНУ МИКОЛАЙЧИК**
**поздравляем с юбилеем!**

*Хотим пожелать тебе самую малость,*
*Чтоб сторонились печаль и усталость,*
*Чтоб бодрой была ты в любую погоду,*
*Здоровья и счастья на долгие годы!*
*Желаем уюта, добра и тепла,*
*Чтоб все неудачи сгорели дотла,*
*Чтоб жить на земле до ста лет довелось,*
*Пусть сбудется всё, что ещё не сбылось.*

**С любовью мама, сёстры и их семьи**

**УВАЖАЕМЫЙ ГЕННАДИЙ ЛЕОНИДОВИЧ ЧУБРИК!**
**Поздравляем Вас с днём рождения!**

*Пожелать хотим мы от души,*
*Чтобы дела любые удавались,*
*Чтоб всегда была счастливой жизнь*
*И мечты прекрасные сбывались.*
*Радости, здоровья, долгих лет,*
*Пусть во всём удача помогает,*
*И на всё, что хочется успеть,*
*Времени и сил всегда хватает!*

**Коллектив работников Мостовского РОВД**

**УВАЖАЕМАЯ НАТАЛЬЯ ВАСИЛЬЕВНА ЗАРЕМБЮК!**

*Вас поздравляем с праздником счастливым,*
*Прекрасный возраст -- Вам 55,*
*Пусть будет жизнь у Вас всегда красивой,*
*И ждёт мгновений ярких водопад.*
*Согреют сердце Ваше пожеланья:*
*Успехов Вам во всём и добрых дней,*
*Энергии, здоровья, процветания,*
*Пусть Вам подарит радость юбилей!*

**Коллектив работников ГУО «Ясли-сад №6 г. Мосты»**

**ДОРОГАЯ И ЛЮБИМАЯ ЖЕНА, МАМОЧКА ЕЛЕНА ДМИТРИЕВНА КУХЛЕЙ!**
**Поздравляем тебя с юбилеем!**

*От чистого сердца, простыми словами,*
*Позволь с юбилеем поздравить тебя!*
*За то, что ты есть, что ты с нами*
*Обнять тебя крепче любя!*
*За доброе сердце, за нежность, за ласку,*
*Что ты нам всегда отдаёшь,*
*За то, что и труд, и заботу, и радость*
*В семью ты по жизни несёшь.*
*Пусть годы летят - ты не будь им подвластна,*
*Пусть в сердце тепло не исчезнет вовек,*
*Здоровья тебе и огромного счастья,*
*Наш любимый, родной человек!*

**Муж, дети**

**ДОРОГАЯ ЛЮДМИЛА ВЛАДИМИРОВНА ДУБИЦКАЯ!**
**Поздравляем тебя с 55-летием!**

*Желаем жить и быть любимой,*
*Не горевать, не унывать,*
*И по дороге жизни длинной*
*С улыбкой весело шагать.*
*Пусть в этот день букетов море*
*Приподнесут тебе друзья,*
*Печаль не тронет глаз красивых*
*И будет лёгкой жизнь твоя.*
*Сияй же ты, как лучик солнца,*
*Будь нежной, ласковой всегда,*
*И пусть наградой будет счастье*
*На все грядущие года!*

**Коллектив работников автомагазинов**

**ДОРОГИЕ СВЕТЛАНА НИКОЛАЕВНА И ГЕННАДИЙ ИВАНОВИЧ ГЕЦОЛЬД!**
**От всей души поздравляем вас с серебряной свадьбой!**

*У вас сегодня юбилей,*
*День радостных переживаний,*
*Пусть будет на душе теплей*
*От добрых слов и пожеланий.*
*Желаем счастья и добра,*
*Здоровья, радости и силы,*
*Душа пусть будет молода,*
*Неважно, сколько лет пробило!*

**Любящие вас мама, папа, дочери Виктория и Екатерина с семьями**

**УВАЖАЕМЫЙ АЛЕКСАНДР ВЛАДИМИРОВИЧ ТАЛАЙ!**
**Поздравляем Вас с днём рождения!**

*Пусть будет добрым каждый час,*
*Прекрасным настроение,*
*Пусть повторятся много раз*
*Счастливые мгновения.*
*Пусть дарит жизнь любовь и свет,*
*Надежду и везение!*
*Желаем счастья, долгих лет,*
*Удач и вдохновения!*

**Коллектив работников Мостовского РОВД**

**УВАЖАЕМАЯ НАША КРЁСТНАЯ ВАЛЕНТИНА АЛЕКСАНДРОВНА РУСАК!**
**Сердечно поздравляем Вас с юбилеем!**

*80 – долгий путь, нелёгкий,*
*Время внуков, правнуков, детей,*
*В этом мире вы не одиноки,*
*Улыбнитесь в этот юбилей.*
**Мы вас любим и уважаем!**

**Мармыши, Газизовы, Кислые, Дудко**

**6 сентября отмечает юбилей**
**ОЛЕГ ПЕТРОВИЧ КЕЙКО!**
**От всей души поздравляем его с этим праздничным днём!**

*50 - особенная дата,*
*Яркий и красивый юбилей,*
*От души -- любви, добра, достатка,*
*Преданных и искренних друзей.*
*Пусть удача в двери постучится,*
*В доме будут мир, покой, уют,*
*Счастье прилетает синей птицей*
*И мгновенья радостные ждут!*

**Семья Макей**

# Разноцветный дождь



**Верите ли, что дождь может быть всех цветов радуги, но при этом капли сухие. Тонны красок, воздушные змеи, пожарные шланги и хорошая музыка – всё это праздник Холи (Colorfest) с индийскими традициями.**

Свои истоки такой фестиваль красок берёт начало из Индии. Жители восточной страны верят в круговорот жизни. Поэтому в начале весны традиционный праздник Холи является отправной точкой весны и пробуждением природы.

Свой интерес, как пожелание счастья, индусы обычно отмечают яркими красками. По преданию считается, чем больше на человека высыпали краски, тем удачней и счастливей будет у него предстоящий год.

Уже два раза за жаркое лето был организован и проведён праздник красок в городе Минске. Следующей площадкой для массового и яркого зрелища стал агротуристический комплекс «Коробчицы». На территории физкультурно-спортивного парка «Олимп» подготовили организаторы для весёлых проводов последних дней лета почти две тонны красок. С волнением и трепетом ждали начала праздника не только самые маленькие приезжие гости, но и их родители. Фестиваль красок собрал «массовку» от 14 до 50 лет.

Этот день должен запомниться надолго! Молодёжь счастлива, что в нынешнем году организовано и проведено большое количество мероприятий подобного рода.

-- Такие праздники дарят много позитива и позволяют на время окунуться в детство, - поделилась эмоциями молодая мама Анжелика Урицкая. – Мы приехали на фестиваль всей семьёй.

Посетители «Коробчиц» устраивали цветные сражения, делали селфи и аплодировали заводным ди-джеям, а также белорусским исполнителям. Веселое сумасшествие длилось до пяти утра. По мнению организаторов и участников, такие «проводы» лета стали одним из ярких в природе.

Краска легко смывается, не портит одежду. Она абсолютна безвредна, поскольку изготовлена из натуральных составляющих. Для тех, кто боится, всегда можно взять с собой солнцезащитные очки для подстраховки.

Вряд ли кому-то удалось остаться в стороне праздника и не проникнуться духом чарующей Индии. Не стоит бояться собрать на себе пятна всех цветов радуги, ведь главное – это минуты счастья!

**А. МАКАР**

Галоўны рэдактар Станіслаў Рышардавіч ЗВЯРОВІЧ

Зара над Нёманам
Мастоўская раённая газета.
Газета выходзіць у сераду і суботу.
У тыдзень выпускаецца два нумары.
Выдаецца ў г.Масты, Гродзенскай вобласці, Рэспубліцы Беларусь.
Заснавальнікі: раённы выканаўчы камітэт, раённы Савет дэпутатаў, працоўны калектыў рэдакцыі.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №1214.
Выдадзена 8 лютага 2010 года Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 231600, г.Масты, вул.Савецкая,34
Індэкс 64033

ТЭЛЕФОНЫ: галоўнага рэдактара --3-21-65, нам. гал. рэдактара -- 3-24-33, адк. сакратара -- 3-22-29, аддзела пісьмаў-- 3-33-45, аддзела сац.-эканамічнага развіцця -- 3-35-85, бухгалтэрыі і аддзела рэкламы -- 3-35-23, камп'ютарнага цэнтра -- 3-23-17, аддзела радыёвяшчання -- 6-13-57.

Наш сайт у інтэрнэце: http: //www.mosty-zara.by
E-mail: zarja@mail. grodno. by

ISSN 2218-919X

Набор і вёрстка камп'ютарнага цэнтра "Зары над Нёманам"
Газета надрукавана афсетным спосабам у ГАУПП "Гродзенская друкарня": 230003, г.Гродна, 3, вул. Паліграфістаў, 4. Разл.рахунак рэдакцыі №3015240090011, РКЦ №10 у горадзе Масты філіяла ААТ «Белаграпрамбанк» -Гродзенскае абласное ўпраўленне, код банка 457, УНП 500126806, ОКПО 02478504.
Падпісана да друку 4 верасня ў 10.00. Тыр. 4 239 Зак. 5213

Адказнасць за падбор і выкладанне фактаў нясуць аўтары публікацый. Выказаныя ў іх думкі могуць не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі і не накладваюць на яе ніякіх абавязкаў.
За змест аб'яў і іншай рэкламы рэдакцыя не адказвае. Усе даведкі ў рэкламадаўцаў.



## Мастоўшчына літаратурная

*Нашаму суседу гораду Шчучыну пашанцавала стаць сёлета цэнтрам правядзення Дня беларускай пісьменнасці. Жыхары гэтага райцэнтра і раёна будуць дэманстраваць удзельнікам і гасцям свята свае дасягненні ў літаратуры, мастацтве, культуры. Туды маюць намер прыехаць масцітыя пісьменнікі, журналісты, хто сёння не ўяўляе свайго жыцця без друкаванага слова, а таксама артысты. А мне з гэтай нагоды захацелася ўспомніць пра літаратурныя традыцыі і нашай Мастоўшчыны. Менавіта ў нашай мясцовасці цесна перакрыжаваліся і ўзаемадзейнічалі дзве плыні -- беларуская і польская, якія прадстаўлены імёнамі Элізы Ажэшка, Сяргея Крыўца, Сцяпана Пятэльскага (М. Арол). Гэта ўжо гісторыя літаратуры. І сёння літаратары Мастоўшчыны плённа працуюць у розных жанрах: публіцыстыка, проза, паэзія, драматургія, гумар і сатыра.*

# Слова далёкае і блізкае, слова чароўнае і непаўторнае

### Нашы продкі вучыліся ў Кракаве, і Эліза Ажэшка любіла наш край

Нашы продкі здаўна паважалі і цанілі разумнага і дасціпнага чалавека, які ведаў паданні свайго краю, умеў складаць і спяваць песні. Вядома, што яшчэ ў XVI стагоддзі з Мастоў, якія знаходзіліся на важных гандлёвых шляхах, вучыліся хлопцы ў Кракаўскім (Ягелонскім) універсітэце. Даследчык гісторыі Уладзімір Арлоў сцвярджае, што нехта Ян з Мастоў нават чытаў шкалярам універсітэта творы Арыстоцеля.

З пашырэннем граматнасці і пісьменнасці, павелічэннем колькасці школ яшчэ шырэй праяўляецца таленавітасць нашых людзей. У сярэдзіне XIX стагоддзя ў Мінявічах часта бывала Эліза Ажэшка. Яна наведвала навакольныя вёскі Глядавічы, Лунна, Багатырэвічы, Панікжаны, любіла адпачываць на цудоўных берагах Нёмана. Асабліва любіла пісьменніца сутракацца і размаўляць з мясцовымі жыхарамі. На мясцовым матэрыяле яна напісала аповесці "Хам", "Нізіны", "Дзюрдзі", знакаміты свой раман "Над Нёманам".

Аб таленавітасці нашых продкаў сведчыць багатая песенная спадчына. У нашым краі бывалі многія факлькларысты. У 50-томным выданні "Беларуская народная творчасць" амаль у кожным томе маюцца песні, казкі, паданні, балады і іншыя ўзоры народнай творчасці, запісаныя на Мастоўшчыне.

У пасляваенныя гады вёску Котчына наведаў патрыярх беларускай музычнай культуры Рыгор Шырма, які запісаў песні ад жыхара гэтай вёскі Мікалая Марцінчыка. Пазней наш край наведвалі вядомыя музыказнаўцы і фальклярысты Э. Ледаховіч, А. Ліс, І. Цішчанка, Г. Барташэвіч, Л. Талай. У вёсках Сінявічы, Галубы, Дубна, Заполле, Кулёўшчына, Зарудаўе яны запісалі шмат песень.

### Яркія знічкі на паэтычным небасхіле

У 1910-1912 гадах у вёсцы Струга працаваў настаўнікам Сцяпан Пятэльскі, ён пісаў вершы і быў вядомы як паэт М. Арол. Цэнтральнае месца ў яго творах займаюць праблемы сацыяльнай няроўнасці і вобраз паднявольнага роднага краю. У 1913 годзе ён падрыхтаваў зборнік паэзіі "Лірнік" і паслаў яго ў Віленскае выдавецкае таварыства, але выхаду перашкодзіла Першая сусветная вайна. На пачатку вайны Сцяпан Пятэльскі быў мабілізаваны ў армію. Прымаў удзел у баявых дзеяннях, узнагароджаны Георгіеўскім крыжам.

У гады знаходжання нашага краю пад уладай буржуазна-памешчыцкай Польшы на Мастоўшчыне жылі і тварылі два паэты-самавучкі. Сяргей Крывец і Міхась Явар. Сяргей Крывец нарадзіўся ў 1909 годзе ў вёсцы Сухінічы ў беднай сялянскай сям'і. З 1915 па 1921 гады разам з сям'ёй апынуўся ў бежанстве ў Саратаўскай губерні. Пасля вяртання на радзіму быў пастухом, парабкам, цесляром. Займаўся самаадукацыяй. Некалькі разоў беспаспяхова спрабаваў перайсці польска-савецкую мяжу. Пасля аб'яднання Усходняй і Заходняй Беларусі С. Крывец вучыўся у Беластоцкім педагагічным інстытуце. У 1944 годзе быў прызваны ў Чырвоную армію, удзельнічаў у баях за вызваленне Польшы. Пасля цяжкага ранення пад Гдыняй памёр. Друкаваўся ў прагрэсіўных заходнебеларускіх выданнях. Пісаў на беларускай, рускай, польскай і нямецкай мовах. Але толькі ў 1972 годзе выйшаў зборнік вершаў паэта "Дубок". Вядомы літаратуразнаўца Уладзімір Калеснік ацаніў паэзію нашага земляка: "Прысутнасць агульначалавечага, гуманістычны пафас і філасафічнасць робяць лепшыя творы Сцяпана Крыўца даўгавечнымі, хвалюючымі, жывымі і для сучаснага чытача".

Заблішчаў яркай зоркай на паэтычным небасхіле талент Міхася Явара. Заблішчаў і хутка знік. Сапраўднае прозвішча паэта Карась, нарадзіўся ён у вёсцы Мінявічы, якая знаходзіцца ў непаўторных па прыгажосці мясцінах, на беразе велічнага Нёмана. У Мінявічах прайшло дзяцінства будучага паэта. Затым распачалася Першая сусветная вайна, і ён разам з бацькамі апынуўся ў бежанстве. У дваццатыя гады вярнуліся дамоў, сустрэча з роднымі мясцінамі аказалася невясёлай: вёску спалілі казакі, зямлі было мала, а сям'я вялікая. Каб дапамагчы сям'і, Міхась пачаў рыбачыць. Ён добра ведаў рыбныя мясціны, лавіў шмат і ў любое надвор'е, а затым прадаваў рыбу гандлярам у мястэчку Лунна, што за дзесяць кіламетраў ад Мінявіч. Акрамя паэтычнага дару, меў прыгожы голас і часта спяваў народныя песні. З цягам часу Нёман даў знаць аб сабе невылечнай на той час хваробай -- сухоты. Можа, хвароба, а можа, нешчаслівае каханне прывяло паэта-рамантыка да самагубства. На беразе свайго любімага Нёмана сонечным ліпеньскім днём ён выстраліў сабе ў грудзі. Хлопца адвезлі ў гродзенскі шпіталь, дзе ён і памёр 27 ліпеня 1933 года. Па ўспамінах відавочцаў, на пахаванне Міхася Явара сабралася многа людзей, пахавалі яго на відным месцы на могілках у Навасёлках, непадалёку ад Нёмана, які пры жыцці натхняў яго на творчасць.

### Літаратурныя шляхі вялі іх праз Мастоўшчыну

Далёка ад Мастоўшчыны нарадзіўся Піліп Пястрак. А ў 1908 годзе лёс закінуў яго сям'ю на чыгуначную станцыю Масты, бацька Піліпа Пестрака працаваў чыгуначнікам. Гэты факт пазней пісьменнік зафіксаваў у сваіх біяграфічных нататках "Праз жыццё":

--Памяць сягае недзе да пятага года свайго жыцця, калі бацька мой служыў на чыгуначнай станцыі Масты, недалёка ад Гродна, і разам з ім жылі і мы -- маці і дзеці. Цяпер, калі даводзіцца ехаць да Гродна і поезд спыняецца ў Мастах, я заўсёды з акна вагона пільна разглядаю наваколле, каб запрыкмеціць што-небудзь знаёмае...

Некалькі гадоў свайго дзяцінства правёў у Лунна паэт Пятрусь Макаль. Ён жыў у дзіцячым доме і вучыўся ў Лунненскай сярэдняй школе. Ужо тады пачаў праяўляцца паэтычны талент хлопца, а ў 21 год Пятрусь Макаль быў прыняты ў члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. З Лунна яго шлях ляжаў у Гродна, дзе П. Макаль спачатку закончыў будаўнічы тэхнікум, а пазней педагагічны інстытут і працаваў літсупрацоўнікам газеты "Гродзенская праўда".

У пасляваенны час фалькларыст Лявон Бараг шэраг казак запісаў ад Івана Мазалеўскага, які нарадзіўся ў 1884 годзе ў вёсцы Вайнілавічы, а апошнія гады жыцця правёў у Мастах. Адна з казак "Разумны хлопчык" у перакладзе на нямецкую мову змешчана ў зборніку "Беларускія народныя казкі", што выйшла з друку ў Берліне.

### І сёння пішуць вершы і раманы

У вёсцы Вайнілавічы ў 1950 годзе нарадзіўся Анатоль Варабей. Ён закончыў Курылавіцкую сярэднюю школу, а пазней філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Як крытык і літаратуразнаўца, даследуе гісторыю беларускай літаратуры. З 1988 года ён член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

На Мастоўшчыне і сёння жывуць і займаюцца творчасцю некаторыя нашы сучаснікі. У Стральцах доўгі час жыла і працавала Ірына Навуменка-Данік. Яна піша вершы з дзяцінства, друкавалася ў часопісах "Полымя", "Літаратура і мастацтва", "Работніца і сялянка" і, вядома ж, у нашай "Зары над Нёманам". Ірына Мікалаеўна таксама член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Яе вершы здзіўляюць сваёй адметнасцю, неардынарным бачаннем свету і адлюстраваннем гэтага бачання ў паэтычных вобразах.

Лявон Вашко--журналіст, драматург празаік. Некаторы час працаваў карэспандэнтам у газеце "Зара над Нёманам". Выдаў зборнікі апавяданняў "Еўрапейскія гісторыі", "Паэты-цары".

У Мастах нарадзілася і жыве Зінаіда Біліда. Вершы таксама піша з дзяцінства. У свет выйшлі шэсць яе зборнікаў: "Крык душы", "Бегущая волна", "Солнечный лучик" для дзяцей, апошні зборнік "Вкус полыни".

Бурны росквіт літаратурных талентаў Мастоўшчыны працягваецца. У вёсцы Падбараны жыве і працуе над сваімі раманамі член Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксей Сазанчук.

У газеце "Зара над Нёманам пачынала творчы шлях у журналістыку і літаратуру Аксана Галубовіч, зараз яна працуе на тэлебачанні ў Гродна. У мінулым годзе выйшла з друку яе першая кніга апавяданняў і эсэ "Насустрач жыццю". Роздум пра сэнс чалавечага жыцця і месца чалавека ў гэтым свеце -- галоўная яго тэма. Творы маладой пісьменніцы вызначаюцца тонкім літаратурным густам і інтэлігентнасцю. Немагчыма не заўважыць яшчэ адной асаблівасці яе прозы-- даверліва-спавядальны стыль.

Літаратурныя традыцыі нашага краю, можа, і не такія багатыя, як у іншых, але гэта наша агульная скарбонка, значная частка нашай духоўнай мясцовай культуры.

**Я. ЦЕСЛЮКЕВІЧ**